**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА ―Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
_________________Ю.П. Бондар
― ―_________________ 2012
Рэгістрацыйны № УД _______/баз

# СТВАРЭННЕ ФАКТАГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАДУКЦЫІ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (менеджмент)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мінск 2012**

**Складальнік:**

*В.І.Саітава,* дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*Д.В.Скубілаў,* загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры дзяржаўнай установы ―Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна”;
*С.В. Зыгмантовіч,* загадчык кафедры менеджмента інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 1 ад 20.09.2012 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 1 ад 24. 09. 2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю
Адказны за выпуск *В.І.Саітава*

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна –Єстварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі” вывучаецца студэнтамі 4 курса факультэта інфармацыйна-дакументацыйных камунікацый як курс па выбару.

Актуальнасць засваення гэтай дысцыпліны абумоўлена неабходнасцю авалодвання студэнтамі прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў для стварэння краязнаўчай фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі.

*Мэтай* дысцыпліны з'яўляецца вывучэнне сучасных тэхналогій вытворчасці краязнаўчай (рэгіёназнаўчай) фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі. Актуальнасць дысцыпліны абумоўлена значным узрастаннем дзейнасці бібліятэк розных відаў і тыпаў па падрыхтоўцы фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў як з прымяненнем традыцыйнай, так і на аснове аўтаматызаванай тэхналогіі.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае вырашэнне наступнага кола *задач*:

- раскрыць значэнне фактаграфічнага сегмента краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў для інфармацыйнага забяспячэння рэгіянальнага развіцця і папулярызацыі краязнаўчых ведаў;
- забяспечыць авалодванне традыцыйнай і аўтаматызаванай тэхналогіямі падрыхтоўкі краязнаўчай фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі незалежна ад форм яе існавання.

У выніку засваення дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

- тэарэтыка-метадычныя падставы падрыхтоўкі фактаграфічнай інфармацыйнай краязнаўчай прадукцыі;
- разнастайнасць і асаблівасці аб’ектаў фактаграфічнага адлюстравання;
- спецыфіку апісання краязнаўчых фактаў;
- тэхналагічныя этапы падрыхтоўкі фактаграфічных краязнаўчых дапаможнікаў;
- прызначэнне і метадычныя асаблівасці асобных відаў, тыпаў і жанраў фактаграфічных інфармацыйных дапаможнікаў па краязнаўстве.

Студэнт павінен *умець:*

- выяўляць, вывучаць, аналізаваць і сістэматызаваць рэгіёназнаўчыя фактычныя аб’екты (звесткі) з улікам асаблівасцей ствараемых краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў;
- ствараць фактаграфічныя запісы рознай ступені складанасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ствараць краязнаўчую фактаграфічную інфармацыйную прадукцыю шырокага жанрава-тыпалагічнага асартымента і розных форм фіксацыі інфармацыі.

Дысцыпліна ―Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі” цесна звязана з шэрагам іншых вучэбных дысцыплін. Адносна дысцыпліны ―Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” яна паглыбляе ўяўленні студэнтаў аб праяўленні фактаграфічнасці краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі. З раздзеламі, прысвечанымі дакументалогіі і гісторыі кнігі, дысцыпліны ―Тэорыя інфармацыі і дакументалогія” яе аб’ядноўвае вывучэнне спецыфікі дакументных крыніц інфармацыі, што з’яўляюцца крыніцамі выяўлення фактычных даных. З дысцыплінай ―Бібліяграфазнаўства. Тэорыя” прасочваюцца сувязі ў аспекце вывучэння фактаграфічнай прыроды бібліяграфічнай інфармацыі. З дысцыплінай ―Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы” звязана праз вывучэнне складу краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага фонда і тэхналогіі бібліяграфавання.

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій пры вывучэнні дысцыпліны ―Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі”, якія садзейнічаюць засваенню і фарміраванню прафесійных ведаў і ўменняў, выдзелім:

– метады інфармацыйнага пошуку, ідэнтыфікацыі і інш.;
– тэхналогію вучэбна-даследчай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне.

У мэтах фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў пры правядзенні семінарскіх і практычных заняткаў выкарыстоўваюцца методыкі актыўнага навучання.

Паводле графіку выконваецца і кантралюецца самастойная работа студэнтаў.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны ―Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі” адводзіцца 34 гадзін аўдыторных заняткаў: 18 – лекцыі, 2 – семінарскія, 4 – практычныя, 10 лабараторныя заняткі. Рэкамендуемая форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы раздзелаў і тэм | Усяго гадз. | Лек. | Сем. | Лаб. | Практ. |
|---|---|---|---|---|---|
| Уводзіны | 1 | 1 | | | |
| Тэма 1. Тэарэтыка-метадычныя пытанні стварэння краязнаўчых фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў | 2 | 2 | | | |
| Тэма 2. Методыка падрыхтоўкі краязнаўчых календароў | 6 | 2 | | 4 | |
| Тэма 3. Методыка падрыхтоўкі краязнаўчых даведнікаў і дайджэстаў | 7 | 5 | | 2 | |
| Тэма 4. Методыка падрыхтоўкі пуцевадзіцелей па краі (населеным пункце) | 6 | 4 | | 2 | |
| Тэма 5. Тэхналогія стварэння фактаграфічных і камбініраваных баз даных па краязнаўстве | 12 | 4 | 2 | 2 | 4 |
| Усяго гадзін | 34 | 18 | 2 | 10 | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ КУРСА

### Уводзіны

Мэты, задачы вучэбнай дысцыпліны –Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі ў бібліятэцы". Яе значэнне і месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і бібліяграфіі. Сувязь з іншымі дысцыплінамі агульнавуковага і прафесійнага цыклаў. Забяспечанасць тэарэтычнай, вучэбнай і метадычнай літаратурай.

Структура вучэбнай дысцыпліны. Характарыстыка асноўных праблем, вывучаемых у яе межах. Асноўныя формы аўдыторнай і самастойнай работы студэнтаў. Выніковыя і прамежкавыя формы кантролю.

### Тэма 1. Тэарэтыка-метадычныя пытанні стварэння краязнаўчых фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў

Фактаграфічная інфармацыя па краязнаўстве як разнавіднасць другаснай фактаграфічнай інфармацыі і частка нацыянальных фактаграфічных рэсурсаў.

Аб'екты фактаграфічнай інфармацыі па краязнаўстве: геаграфічныя назвы, персаналіі, арганізацыі, установы, статыстычныя даныя, падзеі, даты, адрасныя звесткі і інш.

Асноўныя рысы фактаграфічнай інфармацыі: аднатыпнасць, строгая ўпарадкаванасць элементаў (запісаў), хуткасць пошуку інфармацыі, фрагментарнасць (выбарнасць), дакладнасць звестак, аператыўнасць папаўнення (карэкціроўка, замена), адсутнасць факталагічнага аналізу і аўтарскай інтэрпрэтацыі аб'ектаў адлюстравання.

Метады выяўлення аб'ектаў фактаграфічнай інфармацыі ў дакументах (тэкстах), электронных рэсурсах, нацыянальных і замежных фактаграфічных рэсурсах, крыніцах вуснай гісторыі. Вызначэнне аўтарытэтнасці крыніц (навізны і навуковай абгрунтаванасці, дакладнасці матэрыялу).

Лагічная перапрацоўка знойдзенай фактаграфічнай інфармацыі. Апісанне факта, распрацоўка структуры апісання. Ідэнтыфікацыя тыпа асобных аб'ектаў характэрнымі для яго атрыбутамі. Апісанне персаналіі (варыянты імя на беларускай, рускай мовах і лацінскай графіцы, псеўданімы, крыптанімы і іншыя адметнасці; даты жыцця, месца нараджэння, роду дзейнасці, ўзнагароды і званні, геаграфічныя аб'екты, з якімі звязана асоба і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інш.). Асаблівасці апісанняў гістарычных падзей, дат, арганізацый, установ і інш.

Аднаўзроўневыя фактаграфічныя запісы, асаблівасці двухузроўневых і шматузроўневых фактаграфічных запісаў.

Мэтазгоднасць і спосабы камлексіравання фактаграфічнай інфармацыі з іншымі відамі сацыяльнай інфармацыі (макрааб'ектамі).

Фактаграфічнае аснашчэнне электронных краязнаўчых бібліяграфічных каталогаў (баз даных тыпу ―Краязнаўчая літаратура"). Значэнне слоўнікаў карыстальнікаў да электроннага краязнаўчага даведачнага апарата як універсальных інфармацыйных фактаграфічных масіваў рэгіёнаў.

**Тэма 2. Методыка падрыхтоўкі краязнаўчых каляндароў і іншых жанраў храналагічнага характару**

Прызначэнне каляндароў, ствараемых бібліятэкамі і іх разнавіднасці. Асноўныя крыніцы выяўлення дат і адлюстроўваемых у сувязі з імі аб'ектаў: персон, падзей, населеных пунктаў, установ і арганізацый і інш. Крытэрыі адбора дат. Вывучэнне выяўленага матэрыялу, стварэнне фактаграфічнага запісу згодна вызначанай структуры (мадэлі). Прадстаўленне падрыхтаванага матэрыялу ў друкаванай і электроннай формах. Фактаграфічныя БД памятных дат.

Прызначэнне і метадычныя асаблівасці іншых фактаграфічных рэсурсаў, заснаваных на храналагічным прынцыпе арганізацыі матэрыялу: падрыхтоўка апісанняў каляндарных падзей рэгіёна (населенага пункта) для раздзела навін на сайтах бібліятэк; краязнаўчых хронік (летапісаў краю (населенага пункта), хронік культурнага жыцця абласцей і інш.

**Тэма 3. Методыка падрыхтоўкі краязнаўчых даведнікаў і дайджэстаў**

Прызначэнне краязнаўчых даведнікаў і іх тэматычная разнастайнасць. Шырыня фактаграфічных аб'ектаў адлюстравання ў даведніках. Значэнне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адрасна-даведачных звестак, кантактнай інфармацыі ў складзе фактаграфічнай інфармацыі для даведнікаў.

Асаблівасці біяграфічных (персанаграфічных) даведнікаў, прысвечаных ураджэнцам і дзеячам рэгіёна (населенага пункта), мясцовым родам. Даведнікі тапанімічнага характару, у т.л. урбанімічныя тыпу “Назвы вуліц…”; геральдычныя. Даведнікі, прысвечаныя мясцовай прыродзе, эканоміцы і інш. Універсальныя даведнікі тыпу “Факты аб краі (населеным пункце)”.

Выяўленне тэм высокага попыту сярод карыстальнікаў для падрыхтоўкі дайджэстаў. Падбор тэкставых фрагментаў, статыстычных даных і іншых фактаграфічных звестак для дайджэстаў.

## Тэма 4. Методыка падрыхтоўкі пуцевадзіцелей па краі (населеным пункце)

Вызначэнне зместу і формы краязнаўчых пуцевадзіцелей. Тэматычныя пуцевадзіцелі: пуцевадзіцелі па знакамітых мясцінах рэгіёну (населенага пункта), аб помніках гісторыі і культуры, эколага-краязнаўчыя пуцевадзіцелі, па бібліятэках рэгіёна і інш. Распрацоўка схемы апісання аб’ектаў; суадносіны гістарычных і сучасных звестак. Тэкставыя, ілюстрацыйныя, бібліяграфічныя матэрыялы ў пуцевадзіцелях. Прадстаўленне пуцевадзіцелей ў друку і электроннай форме.

## Тэма 5. Тэхналогія стварэння фактаграфічных і камбінiраваных баз даных па краязнаўстве

Фактаграфічная ўніверсальная база даных аб рэгіёне (населеным пункце). Архіў краязнаўчых даведак як аснова стварэння фактаграфічнай базы даных. Магчымасць уключэння макрааб’ектаў: тэкстаў, ілюстрацыйных матэрыялаў і іншых да фактаграфічных запісаў.

Фактаграфічныя і камбініраваныя базы даных цэнтраў бібліятэчнага краязнаўства ў Беларусі (“Край мой, Магілёўшчына”, “Прыдзвінскі край”, “Памяць …рэгіёна” і інш.): змест, структура, пошукавыя магчымасці, віды прадстаўленай інфармацыі. Характарыстыка этапаў фарміравання БД.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карпаратыўны характар дзейнасці пры стварэнні і распаўсюджванні БД. Нарматыўна-прававыя патрабаванні да работы бібліятэк з базами даных.

Стварэнне рэгіянальных геаграфічных, персанальных і іншых слоўнікаў да базы даных краязнаўства электроннага каталога бібліятэкі. Адлюстраванне геаграфічных мікрааб’ектаў, асоб і падзей рэгіянальнага ўзроўня.

Сувязі краязнаўчых фактаграфічных баз даных з беларусазнаўчымі БД “Беларусь у асобах і падзеях” “Ученые Беларуси” і з нацыянальнай БД аўтарытэтных запісаў (BELMARC/Authorities).

Тэхналогія выкарыстання аўтарытэтных баз даных ў стварэнні фактаграфічных баз даных па краязнаўству. Прымяненне структуры аўтарытэтных запісаў на персаналіі (асобы), родавыя імёны, арганізацыі (калектывы), геаграфічныя аб’екты, гандлёвыя маркі, найменні тэматычных прадметаў (для гістарычных падзей), назвы твораў. Даведачны патэнцыял палёў (падпалёў) 3XX, 4XX, 5XX (тэкставыя звесткі, варыянты імён і звязаныя з імі аб’екты), 640 (месцы і даты), 856 (графічныя і аўдыявідэаматэрыялы) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*


1. Ажеева, Р.Б. Историко-краеведческая деятельность публичных библиотек : учеб. пособие / Р. Б. Ажеева. – Москва : Литера, 2011. — 105 с. – (Серия "Современная библиотека" ; вып. 88).
2. Библиотечное краеведение : терминолог. словарь / сост. В.С. Крейденко, А. В. Мамонтов. – СПб., 1998. – 85 с.
3. Демидова, С.Е. Краеведческий документ : библиотечная обработка : учебно-практическое пособие / С.Е. Демидова. – Москва : Либерея-Бибинформ, 2006. –104 с. – (Серия ―Библиотекарь и время. XXI век»).
4. Ильина, С.В. Технология использования авторитетных баз данных в создании фактографических баз данных по краеведению / Ильина С.В. // Бібліятэчны веснік : [зборнік артыкулаў] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; [рэдкалегія: Р. С. Матульскі (старшыня) і інш.]. – Мінск, 2010. — Вып. 2. — С. 167—174.
5. Кузьмініч, Т.В. Бібліятэчны сегмент нацыянальных фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў: тэарэтыка-метадычны аналіз / Т.В. Кузьмініч // Бібліятэчны веснік : зборнік артыкулаў. Вып. 1. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск, 2010. – С.45 – 60.
6. Краеведческие указатели и БД // Справочник библиографа. – Изд. 2-е, перераб. и доп. – СПб., 2003. – С. 420 – 431.
7. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк : метад. рэкамендацыі / Нац. б-ка Беларусі; склад. Р.М. Чыгірова, М.У. Сокал. — Мінск, 1994. — 102 с.
8. Неверова, Т.А. Краеведческая деятельность библиотек. – Москва : Либерия, 2005. – (Библиотекарь и время. XXI век. Вып. 28).
9. Пупчина, Н.В. Создание фактографической базы данных по краеведению и использование ее в формировании гражданского и патриотического самосознания у детей / Н.В. Пупчина // http://rudocs.exdat.com/docs/index-258274.html?page=2.
10. Сомова, Т.Н. Краеведческая деятельность детской библиотеки : учеб.-практ. пособие / Т.Н. Сомова ; Орловский гос. инт-т искусств и культуры. – Москва : Либерея-Бибинформ, 2006. – 88 с.
11. Тараненко, Л.Г. Информационное обеспечение потребностей региона: специфика краеведческой деятельности библиотек : учеб. пособие / Тараненко, Л.Г. – Москва : Литера, 2009. – 160 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. Тараненко, Л. Г. Оценка состояния электронных краеведческих ресурсов региональных и муниципальных библиотек / Л. Г. Тараненко // Библиосфера. – № 1. – 2011. –С. 67–70.

*Дадатковая*

1. Василенко, А.М. Генерация баз данных по краеведению / А.М. Василенко //www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2005/disk/81.pdf.
2. Грибков, Д. Н. Формирование электронного информационного пространства региона: из опыта общедоступных библиотек Орловской области / Д. Н. Грибков, Е. В. Тимошук // Науч. и техн. б-ки. – 2011. – № 6.– С. 75 – 79.
3. Гришина, С. Средство спасения или инструмент развития. Краеведческая работа муниципальной библиотеки в современных условиях // Библитечное дело. – 2010. – № 22. – С.37 – 39.
4. Захарова, Г.Н. Краеведческий аспект деятельности региональной библиотеки / Г.Н. Захарова // Науч. и техн. б-ки. – 2008. – № 9 . – С.35 – 44.
5. Коновалова, Н. Работа Гомельской областной универсальной библиотеки имени В. И. Ленина по изучению и сохранению историко-культурного наследия региона / Н.Коновалова, Н. Серикова // Бібліятэчны свет . — 2011. — № 2. — С. 30—31.
6. Краеведческая деятельность библиотек Гомельской области : анализ состояния / сост. И.И. Лобачёва; отдел библиотековедения ГОУБ. – Гомель, 2010. – 24 с.: ил.
7. Краязнаўства Берасцейшчыны: стан і перспектывы развіцця : матэрыялы "круглага стала", 12 снежня 2006 года / [рэдкалегія: Т. П. Данілюк, А. М. Мяснянкіна, Т. С. Кавенька]. – Брэст : БрДУ, 2007. — 56 с., [10] л. каляр. іл.
8. Кузьминич, Т. В. Фактографические базы данных Национальной библиотеки Беларуси: новый этап развития / Т. В. Кузьминич // Развитие информатизации и государственной системы научно-технической информации : РИНТИ–2009 : VIII Международной конференции, 16 ноября 2009 г. – Минск, 2009. – С. 200–204.
9. Кулемеева, Л.А. Опыт создания Словаря ключевых слов сектором краеведческой библиографии ЦГБ им. Н.В. Гоголя г. Новокузнецка /Л.А. Кулемеева // http://www.kemrsl.ru/documents/founds/vip1/vip1.5.htm.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. Окольникова, С.А. Региональные проекты по сохранению культурного наследия: «вторая жизнь» уникальных книг и книжных коллекций / С.А. Окольникова // Библиотековедение. – 2011. – № 1. – С. 52–56.
11. Предеина, А.В. Создание краеведческих электронных информационных ресурсов: тенденции развития / Предеина А. В. // Библиотечное краеведение как фактор повышения культурного потенциала края : методические материалы / Учреждение "Гомельская областная универсальная библиотека им. В. И. Ленина", Отдел библиотековедения ; [составитель М. С. Рафеева]. – Гомель, 2009. — С. 2—6.
12. Проблемы краеведческой деятельности библиотек : материалы Всерос. науч.-практ. семинара (Великий Новгород, сентябрь 2002 г.). – СПб., 2003. – 258 с.
13. Пронина, Л.А. Электронные коллекции краеведческих информационных ресурсов: библиоэкологические аспекты / Л.А. Пронина, Н.Е. Копытова, Н.В. Шаталова, А.Н. Евстигнеев, В.В. Дубенский // Методологические и теоретические проблемы библиографии в контексте новых информационных технологий : сборник статей. / Рос. Гос. б-ка ; НИО библиографии. – Москва : Пашков дом, 2007. – С. 76–83.
14. Томашева, Е.Н. Краеведческая библиотечно-библиографическая деятельность детских библиотек : учеб. пособие / Е.Н. Томашева. – СПб., 1996. – 89 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ